**Установа адукацыі**
**“Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”**

# Беларускі традыцыйны касцюм

***вучэбная праграма***
***для вышэйшых навучальных устаноў***
***па спецыяльнасці 1-18 01 01 “народная творчасць” (па напрамках)***
***напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-04 “народныя рамёствы”***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2012

Складальнік:

Л.У. Дамнянкова, дацэнт кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат гістарычных навук.

Рэцэнзенты:

Лазука Б.А. кандыдыт мастацтвазнаўства, дацэнт, загадчык адзела старажытнабеларускай культуры ІМЭФ НАН Беларусі.

Гулак А.А. кандыдат філалагічных навук, старшы выкладчык кафедры этналогіі і фальклору БДУКМ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ЗАЦВЯРДЖАНА:

Кафедрай народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол №1 ад 28.08.2012 г.).

## Тлумачальная запіска

Касцюм беларусаў з'яўляецца адным з яскравых і візуальна ўспрымаемых праяў нацыянальнай культуры, выказнікам эстэтычнага ідэалу прыгажосці, адлюстраваннем ментальнасці народа. Як элемент нацыянальнай культуры, касцюм цесна звязаны з гісторыяй народа, адлюстроўвае кардынальныя змены ў грамадстве, накірункі культурных прыярытэтаў.

На фарміраванне касцюма беларусаў аказалі ўздзяенне самыя разнастайныя фактары: прыродна-кліматычныя, сацыя-палітычныя, эканамічныя, светапоглядныя і г.д. Сацыяльная стратыфікацыя садзейнічала з'яўленню двух асноўных накірункаў у развіцці касцюма: народнага і арыстакратычнага.

Архаічныя светапоглядныя ўяўленні сялянства, рытм і лад жыцця асаблівасці развіцця комплексаў адзення, спрыялі кансервацыі шэрагу рыс. Базуючыся на архетыпах светапоглядных уяўленняў, якія будуюцца па бінарнаму прынцыпу (дабро-зло, свой–чужы, мужчына–жанчына, і г.д.), традыцыйны касцюм змяшчаў інфармацыю пра свайго ўласніка. Знакавы (семантычны) характар адзення сумесна з утылітарным адлюстроўваў пол, ўзрост, паходжанне, этнас, канфесію, сацыяльны стан. Таму ўсебаковае вывучэнне традыцыйнага кастюма пашырае уяўленні аб ментальнасці беларусаў.

Аналіз пластычных, дэкаратыўных, канструктыўных, тэхналагічных, семантычных асаблівасцей касцюма накіраваны на фарміраванне высокакваліфікаваных спецыялістаў у розных галінах нацыянальнай культуры.

**Мэты і задачы курса**

Асноўная задача — развіццё здольнасцей студэнтаў, набыццё ведаў і навыкаў аналізу такой складанай з'явы як касцюм, яго архітэктонікі, паглыбленнае вывучэнне народнага тэкстылю, яго адметных рыс і ўвядзенне іх ў сучасную культуру беларусаў. Улічваюцца веды студэнтаў па гісторыі Беларусі, гісторыі выяўленчага мастацтва і архітэктуры і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, па спецыяльных дысцыплінах.

Неабходнасць паглыбленага аналізу народных строяў усіх гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі прадугледжвае шырокае выкарыстоўванне ілюстрацый (слайды, фотаздымкі), знаёмства з аўтэнтычнымі формамі адзення і галаўных убораў, якія захоўваюцца ў музеях Беларусі і прыватных калекцыях, а так сама выкананне замалёвак і апісанняў. Пры вывучэнні касцюма асаблівая ўвага надаецца раскрыццю стылявых, пластычных, дэкаратыўна-арнаментальных, канструктыўных асаблівасцей традыцыйнага адзення, галаўных убораў, упрыгожанняў, абутку.

Праграмай прадугледжаны *лекцыі*, якія забяспечваюць тэарэтычную базу; *семинарския заняткі,* на якіх замацоўваюцца ўяўленні пра асаблівасці развіцця беларускага касцюма; *самастойная праца* студэнтаў, якая накіравана на наведванне музейных экспазіцый, выкананне навукова-даследчых прац і ўдзел у канферэнцыях.

По заканчэнні курса прадугледжваецца выкананне рэферата і экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПРЫКЛАДНЫ НАВУЧАЛЬНА-ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| № | Назва тэмы | Колькасць гадзін | |
|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практыч. заняткі |
| 1. 1 | Уводзіны ў прадмет вывучэння беларускага касцюма. Узнікненне і функцыі касцюма. Вызначэнне асноўных паняццяў. Этнічная спецыфіка беларусскага народнага адзення. | 2 | |
| 2. | Віды матэрыялаў для вырабу адзення. Сродкі і прыёмы аздаблення. | | 2 |
| 3. | Арнамент, асноўныя матывы, колер, спосабы арганізацыі. Апатрапейная функцыя арнаменту. | | 2 |
| 4. | Асноўныя часткі мужчынскага адзення. Мужчынскія прычоскі і галаўныя ўборы | 2 | 2 |
| 5. | Традыцыйны жаночы комплекс, састаўляючыя яго часткі. Канструкцыя, эвалюцыя форм, характар аздаблення. | 2 | 4 |
| 6. | Верхняе адзенне беларусаў. Асноўныя тыпы крою, тэрміналагія, матэрыялы, колер, аздабленне. | | 2 |
| 7. | Дадатковыя элементы народнага касцюма. | | 2 |
| 8. | Рэгіянальныя і лакальныя асаблівасці народнага касцюма. | 2 | 2 |
| 9. | Народны касцюм у абрадах і ўяўленнях беларусаў | | 2 |
| 10. | Народны сцэнічны касцюм. Мастацтва высокай моды і фальклор. | | 2 |
| | Усяго | 8 | 20 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

**Тэма 1. Уводзіны ў прадмет вывучэння беларускага касцюма. Узнікненне і функцыі касцюма. Вызначэнне асноўных паняццяў.**

Касцюм - частка матэрыяльна-духоўнай культуры народа. Вызначэнне паняццяў “адзенне”, “касцюм”, “мода”, “народны строй”.

Узнікненне адзення. Асноўныя формы адзення першабытнага грамадства. Эвалюцыя адзення і яго залежнасць ад прыродна – кліматычных, палітыка – эканамічных, сацыяльна – філасоўскіх і рэлігійных фактараў. Функцыі касцюма.

Праяўленне этнічнай спецыфікі беларукага кастюма праз архітэктоніку, сваеасаблівасць набора кампанентаў, спецыфіку дэкаратыўнага рашэння. Традыцыйныя і інавацыйныя з’явы, механізм іх існавання і ўваходжання ў культуру народнага касцюма. Роля этнакультурных кантактаў.

**Тэма 2. Віды матэрыялаў для вырабу адзення. Сродкі і прыёмы аздаблення.**

Традыцыйныя матэрыялы хатняй вытворчасці для вырабу элемнтаў касцюма - тканіны, скура, аўчына, лямец, салома. Прамысловыя матэрыялы, ступень ужывання ў народным адзенні.

Ткацтва. Сыравіна, працэсы апрацоўкі і падрыхтоўкі да ткання. Тэхнікі ткацтва: двухнітовае і шматнітовае бранае, пераборнае, ажурнае ткацтва. Якасныя і колькасныя паказчыкі тканін, сувязь з прызначэннем адзення, характар і тэхнікі аздаблення (узорнае ткацтва, вышыўка, аплікацыя, набойка). Дадатковая апрацоўка воўны і ваўняных тканін. Сукнаробства, валюшнае рамяство. Шапавальства. Гарбарства. Кушнерства.

**Тэма 3. Арнамент, асноўныя матывы, колер, спосабы арганізацыі. Апатрапейная функцыя арнаменту.**

Віды арнаменту - геаметрычны, раслінны, раслінна-геаметрычны, зааморфны і антрапаморфны. Ромб - асноўны арнаментальны матыў; крыж, трохкутнік, квадрат і г.д. – матывы геаметрычнай арнаментыкі. Бардзюр, сетка, медальён – спосабы арганізацыі арнамента на тканіне. Тэхнікі выканання арнаменту, матэрыялы. Традыцыйнасць чырвона-чорнай колеравай гамы арнаментальных кампазацый. Паліхромія, раслінная арнаментыка крыжыкам і гладдзю — адметныя якасці ХХ стагоддзя. Арнаментыка традыцыйнага касцюма, яго ахоўныя функцыі і уплыў на размяшчэнне на дэталях адзення. Характар арнаменту, тэхнічныя прыёмы, каляровая гама, матэрыялы, кампазіцыйнае размяшчэнне, маштаб і інш.).

**Тэма 4. Асноўныя часткі мужчынскага адзення. Мужчынскія прычоскі і галаўныя ўборы.**

Нацельнае адзенне –“сарочка”, “кашуля”, “рубаха” - асноўная частка мужчынскага строю. Тканіны, крой, аздабленне, спосабы нашэння.

Паясное адзенне – “нагавіцы”, “порткі”. Тканіны, крой, спосаб мацавання на таліі. Безрукаўнае адзенне, асаблівасці ўваходжання ў традыцыйны касцюм. Пакрой, аздабленне.

Агульнаславянская аснова мужчынскіх прычосак. Нашэнне валасоў і барады - даўняя традыцыя. Прычоскі - стрыжка “пад гаршчок”, яе варыянты (у залежнасці ад спосабаў разбірання валасоў на прамы ці касы прабор, зачэсвання ўгару.

Галаўны ўбор - “магерка”, “кучомка”, “аблавуха”, “каўпак”, “стаўбуноўка”, “картуз”, “кепка”, “капялюш” і г.д. - адзнака сацыяльнага і маёмаснага становішча чалавека. Віды, формы, матэрыялы, функцыянальнае прызначэнне, аздабленне галаўных убораў.

**Тэма 5. Традыцыйны жаночы комплекс, састаўляючыя яго часткі. Канструкцыя, эвалюцыя форм, характар аздаблення.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сарочка, матэрыялы, крой (тунікападобная, паліковая, з гэсткай), размеркаванне полак, варынты каўняра, рукавоў, спосабы нашэння. Упрыгожванне сарочкі, размеркаванне аздоб, каларыт.

Паясное адзенне: спадніца, андарак, бурка, палатнянік, сукня, саян, дрыліх і інш. Асаблівасці крою, тэхналогіі, спосабаў нашэння. Аздабленне. Старажытныя формы паяснога адзення – запаска, панёва, запон. Фартух – неад'емная частка жаночага строю. Колькасць полак, характар упрыгожвання.

Нагруднае плечавое адзенне без рукавоў: кабат, гарсэт, карсэт, шнуроўка, кітлік, лейбік. Тканіны, крой, аздабленне раслінным дэкорам, мануфактурнымі вырабамі.

Дзявочыя і жаночыя прьгчоскі і галаўныія ўборы. Тыпы дзявочых вянкоў: вянок-абручык, вянок на каркасе, вянок-шапачка. Ручніковыя галаўныя ўборы - скіндачка, шырынка, апаяска; спосабы павязвання, аздабленне.

Змена прычоскі на жаночую ў ходзе вясельнага абрада. Завіванне валасоў на тканку, хаванне пад чапцом, каптуром, наміткай. Ручніковыя галауныя ўборы: намітка, сярпанка, хустка. Спосабы навівання. Віды і формы чапцоў, асаблівасці нашэння.

**Тэма 6. Верхняе адзенне беларусаў. Асноўныя тыпы крою, тэрміналагія, матэрыялы, колер, аздабленне.**

Характэрныя асаблівасці верхняга адзення беларусаў: адсутнасць спецыяльна мужчынскай і жаночай форм, адсутнасць падкладкі, выразная лакальнасць крою і дэкору. Верхняе адзенне з палатна: насоў, балахон, халат; з лямцаванага тоўстага сукна: світа, бурнос, курта, бурка, латушка; з аўчын: кажух, казачына, шуба.Крої - прамы, раскошаны, да стану з бакавымі клінамі-вусамі, з адразной спінкай  або па ўсёй таліі. Аздабленне паскамі скуры, шнурам, паскамі і кавалкамі кантрастнага сукна, вышыўка.

**Тэма 7. Дадатковыя элементы народнага касцюма.**

Пояс - неабходная частка старажытнага мужчынскага і жаночага касцюма. Роля поляса у фарміраванні сілуэта. Тэхніка вырабу паясоў: вітыя; плеценыя: на пальцах, на сцяне, на калодачцы; тканыя: на дошчачках, на бердзечку, на ніту, на кроснах. Ніткі, колер, арнамент, афармленне канцоў.

Абутак. Матэрыялы. Састаўныя часткі традыцыйнага абутку: абгорткі: анучы, суконкі, завоі; аборы; лапці: беларускія, маскоўскія. Скураны абутак: пасталы (маршачкі, хадакі); чобаты, боты, чаравікі. Абутак гумавы (бахілы), лямцаваны (валёнцы), шыты (буркі).

Здымныя ўпрыгожанні: каралі, пярсцёнкі, завушніцы, характар ужывання.

**Тэма 8. Рэгіянальныя і лакальныя асаблівасці народнага касцюма.**

Народныя строі, тэрыторыі і часы бытвання, адметныя рысы. Заходняе Палессе: кобрынскі, мотальскі, маларыцкі, пінска-івацевічскі строи. Усходняе Палессе: калінкавічскі, брагінскі, турава-мазырскі, давыд-гарадоцка-тураўскі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

строі. Прыдняпроўе: магілёўскі, буда-кашалёўскі, веткаўскі, краснапольскі строі. Цэнтральная Беларусь: пухавіцкі, капыльска-клецкі, слуцкі, вілейскі, ляхавіцкі строі. Панямонне: ваўкавыска-камянецкі, навагрудскі, мастоўскі строі. Наддзвінне і Паазер’е: лепельскі, суражскі, верхнядзвінскі, дубровенскі і парэцкі строі.

**Тэма 9. Народны касцюм у абрадах і ўяўленнях беларусаў.**

Сінкрэтызм народнага касцюма. Абрадавы касцюм і сувязі з духоўным жыццём, звычаямі, рэлігійна-магічнымі, эстэтычнымі ўяўленнямі. Функцыі абрадавага касцюма: абрадавая, знакавая (знакі маёмасных, сацыяльных адрозненняў, канфесіянальнай, нацыянсільнай, рэгіянальнай, лакальнай прыналежнасці, пола-узросткавай, сямейнай дыферэнцыяцыі і інш.), святочная, эстэтычная, практычная, вытворчая (у абрадах аграрнага цыкла), магічная і інш.

Сімвалічная арганізацыя касцюма, знакавая роля яго асобных частак.

Галаўныя ўборы, адзенне, упрыгожанні ў вясельным абрадзе. Асаблівасці касцюма маладой і маладога. Колер касцюма. Пояс. Прычоска і галаўныя ўборы. Завівала. Чапец. Вопратка. Касцюм удзельнікаў вяселля.

Роля адзення ў пахавальных і радзільных абрадах.

Касцюм у звычаях і абрадах, звязаных з сельскай гаспадаркай, каляндарна-вытворчымі абрадамі.

**Тэма 10. Народны сцэнічны касцюм. Мастацтва высокай моды і фальклор.**

Народны касцюм на пляцоўках прафесійнага, аматарскага, этнаграфічнага калектываў фальклорнага накірунку — народны сцэнічны касцюм. Выяўленчыя сродкі касцюма — кампазіцыя, сілуэт, накіроўваючыя лініі, колер і г.д.

Мера ўмоўнасці народна-сцэнічнага касцюма: гісторыка-этнаграфічна дакладная; стылізаваная; вобразна-стылізаваныя, умоўна-эмацыянальиая .

Этапы працэсу стварэння народна-сцэнічнага касцюма ад задумы да сцэнічнага ўвасаблення: праца над эскізам, падбор фактуры матэрыялаў, каларыстычных узораў, пакрой, прымерка, праверка на сцэне асвятленнем, «абжыванне» касцюма акцёрам на рэпетыцыях. Мастакі народна-сцэнічнага касцюма: Ю. Піскун, Г. Юрэвіч, В. Бартлава, В. Дзёмкіна, А. Александровіч.

## Літаратура

**Асноўная**

1. Беларускае народнае адзенне. ‒ Мн.: Навука і тэхніка, 1975. – 95 с.
2. Исенко, С. П. Русский народный костюм и его сценическое воплощение // С. П. Исенко– М.: ИПО Профиздат Московского государственного университета культуры ,1999. – 146 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Калашникова, Н.М. Народный костюм // Н.М. Калашникова – М.: Сварог и К 2002. — 376 с.

4. Маленка, Л. І. Беларускі народны касцюм // Л. І. Маленка − Мн.: Ураджай, 2001. — 160с.

5. Піскун, Ю.А. Варыятыўнасць інтэрпрытацыі народнага касцюма у сцэнічна-выканальніцкай дзейнасці мастацкіх калектываў Беларусі// Ю.А. Піскун − Мн., 2003. – 36 с

6. Раманюк, М.Ф. Беларускае народнае адзенне // М.Ф. Раманюк −Мн.: Беларусь,1981. – 304 с.

7. Раманюк, М.Ф. Беларускае народнае адзенне: [Альбом]// М.Ф. Раманюк – Мн.: Дзяніс Раманюк, 2003. – 80 с.

8. Сахута, Я. М. Народнае мастацтва Беларусі // Я. М. Сахута – Мн.: БелЭн, 1997. – 287 с.

9. Этнаграфія Беларусі: Энцыклапедыя. – Мн.: БелСЭ., 1989. – 575 с.

10. Dziekonska – Koztovska, A. Moda kobieta XX. Wieku./ In-t wrornictwa przemyslovego // A. Dziekonska – Koztovska– Warszawa: Arkady, 1964. – 396 p.

11. Costume national bielorusse: Catalog de l’exposition “Costume national bielorusse”: - Paris: Association France – U.R.S.S., 1981. – 57 p.

**Дадатковая**

1. Барвенава, Г. У сховах забытага гардэроба// Г. Барвенава − Мастацтва. – 1999. – №1. – с. 62 – 65.

2. Балышева Н. С. Белорусская народная одежда как источник идей при создании современного и сценического костюма УП “Скарбніца”// Актуальныя праблемы культуры і мастацтва: [Навук. – інф. зб.] / НББ. – Мн., 2003 Вып. 1 – с. 46 – 50.

3. Бланк, А. Ф. Русская народная одежда и современное платье // А. Ф. Бланк, З. М. Фомина – М., Легкая и пищевая промышленность, 1982. – 176 с.

4. Вальева Г. Поэзия народного костюма: [Как использовать его крой, орнамент для сцены и в повседневной одежде] // Г. Вальева − Культурно – просветит. работа. – 1989. – 1. – с. 62-63.

5. Каминская, Н.М. История костюма //Н.М. Каминская − М.: Легпромбытиздат, 1986.

6. Костюмы к танцам народов СССР. Цветные эскизы. М., Искусство, 1964. – 56 с.

7. Котович Т. Сцена вместо холста :[О бывшем гл. художнике Нац. академич. Драм. Театра им. Я. Коласа Е. Д. Николаеве ( 1913 – 1978 г.)] // Витебский курьер. – 2000. – 24 июня. – с. 3.

8. Мастацтва беларускіх дэкаратараў: Тэатр. Кіно. Тэлебачанне / Аўтар тэксту і склад. А. П. Карнач. – Мн.: Беларусь, 1989. – 159 с.

9. Пармон Ф. М. Композиция костюма. М.: Легбытпромиздат, 1985. – 318 с.

10. Шунейка Я. Ф. Справа ўсяго жыцця // Маладосць: - 1996. - № 7. – с. 127 – 133.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

11. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: У 5 т. / Рэдкал.: І. П. Шамякін ( гал. рэд.) і інш. – Мн.: Бел СЭ, 1984 – 1987. – Т. 1 – 5.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ